# СЁЛЕТА ЗВОДНЫ СТУДЭНЦКІ АТРАД

# УДЗЕЛЬНІКАМ ПРАЦОЎНАГА СЕМЕСТРА—83

Набліжаецца да завяршэння летняя экзаменацыйная сесія. Праз некалькі дзён для 1.100 студэнтаў універсітэта пачнецца новае выпрабаванне — працоўнае. На месца дыслакацыі выедуць байцы 50 атрадаў. Удзельнікі студэнцкага будаўнічага руху, як і ўсе савецкія людзі, наша слаўная моладзь прыкладуць свае намаганні для ажыццяўлення гістарычных рашэнняў XXVI з'езда КПСС і XIX з'езда ВЛКСМ.

**Таварышы байцы!**

**Рэктарат, партком, камітэт камсамола, прафком сардэчна віншуюць вас з паспяховым завяршэннем навучальнага года і пачаткам новага працоўнага семестра. Сёлетняе працоўнае лета будзе праходзіць у перыяд падрыхтоўкі працоўных вобласці да 40-годдзя вызвалення Гомельшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Абавязак байцоў студэнцкіх атрадаў — самаадданай працай, шырокай масава-палітычнай работай сустрэць знамянальны юбілей.**

**Байцы зводнага студэнцкага атрада Гомельскага дзяржаўнага універсітэта будуць працаваць гэтым летам на ўсесаюзнай ударнай камсамольскай будоўлі — Нечарназем'і, меліярацыі зямель беларускага Палесся, узводзіць жылыя дамы, клубы, школы і дашкольныя ўстановы, працаваць праваднікамі пасажырскіх чыгуначных вагонаў і г. д.**

**Дастойным укладам студэнцтва нашай ВНУ ў выкананне Харчовай праграмы, прынятай майскім (1982 г.) Пленумам ЦК КПСС, павінен стаць яго ўдзел ва ўзвядзенні на сяле жывёлагадоўчых комплексаў, аб'ектаў сацыяльнага і культурнага прызначэння, уборцы ўраджаю, перапрацоўцы прадукцыі палёў і ферм.**

**Абавязак кожнага байца — азнаменаваць працоўны семестр-83 высокай якасцю выконваемых работ, праявіць наватарства, ініцыятыву, творчы падыход да справы, разгарнуць шырокае спаборніцтва за паспяховае выкананне і перавыкананне прынятых абавязацельстваў. Асаблівую ўвагу неабходна ўдзяліць строгаму захаванню Статута УСБА.**

**Удзельнікі трэцяга працоўнага семестра закліканы выступаць актыўнымі прапагандыстамі палітыкі КПСС і Савецкай дзяржавы, пераваг сацыялістычнага ладу жыцця, рашэнняў ліпеньскага (1983 г.) Пленума ЦК КПСС, прымаць удзел у рабоце агітбрыгад і лектарскіх груп.**

**Ганаровае імя байца студэнцкага атрада абавязвае кожнага яго ўдзельніка беражліва захоўваць і памнажаць слаўныя традыцыі партыі і народа, моцнай любоўю і цеплынёй акружыць ветэранаў вайны і працы, сем'і былых франтавікоў, прыняць актыўны ўдзел у аперацыях «Памяць», «Салдацкае пісьмо».**

**Рэальным сведчаннем адзінства савецкага студэнцтва з прагрэсіўнай моладдзю планеты стануць дні ўдарнай бясплатнай працы, работа інтэрнацыянальных атрадаў.**

**Рэктарат, партком, камітэт камсамола, прафком выказваюць упэўненасць у тым, што байцы зводнага студэнцкага атрада ГДУ ўсе свае веды і энергію аддадуць справе будаўніцтва камунізму, памножаць працоўныя традыцыі савецкага студэнцтва, з гонарам пранясуць сцяг Ленінскага камсамола. Працоўны семестр-83 стане не толькі фронтам працоўных перамог і ўнясе дастойны ўклад у эканоміку нашай краіны, але і дасць моладзі ўрокі сапраўднай маральнай і ідэйнай загартоўкі.**

**РЭКТАРАТ, ПАРТКОМ,**
**КАМІТЭТ ЛКСМБ,**
**ПРАФКОМ.**



**НА ЗДЫМКАХ:** (злева)—актывісты студэнцкіх будаўнічых атрадаў перад пачаткам юбілейнага, 25-га па ліку працоўнага семестра УСБА абмяркоўваюць маршруты, па якіх адправяцца на месцы сваёй дыслакацыі; (справа) — сакратар камітэта камсамола С. Аўсеенка расказвае байцам будаўнічых атрадаў «Глорыя» і «Чараўніцы» з падрыхтоўчага аддзялення аб слаўнай гісторыі працоўнай і грамадскай дзейнасці СБА універсітэта.

Фота А. Карніенкі.



*Ажыццяўленне Харчовай праграмы—справа кожнага*

## У ПАДШЭФНЫМ САЎГАСЕ

Пачэсным абавязкам кожнага камсамольца універсітэта з'яўляецца яго пасільны ўдзел у вырашэнні Харчовай праграмы. Разам з вялікім атрадам выкладчыкаў, супрацоўнікаў ГДУ яны аказваюць летам адчувальную дапамогу падшэфным гаспадаркам у правядзенні важнейшых сельскагаспадарчых работ. Так, у мінулым годзе калектыў універсітэта ўнёс значны ўклад у стварэнне надзейнай кармавой базы для грамадскай жывёлагадоўлі для саўгаса «Рэчкі» Веткаўскага раёна, што дазволіла падшэфнай гаспадарцы справіцца з высокімі заданнямі па вытворчасці прадукцыі палёў і ферм. Старанна папрацавалі шэфы на праполцы і ўборцы гароднінных і іншых сельскагаспадарчых культур.

У саўгасе «Рэчкі» створан стацыянарны лагер, у якім ёсць усё неабходнае для шэфаў. Кіраўніцтва гаспадаркі стварае добрыя ўмовы для прадукцыйнай працы сваіх памочнікаў-гараджан.

Мінулым летам заезды ў саўгас работнікаў універсітэта праводзіліся праз кожны тыдзень. Усяго за сезон у падшэфнай гаспадарцы працавала каля 500 чалавек, з іх больш двухсот — камсамольцы. Агульнымі намаганнямі ўсіх працуючых былі вырашчаны і сабраны з вялікіх плошчаў морква, агуркі, памідоры, капуста. У перыяд нарыхтоўкі кармоў шэфы накіравалі значныя сілы на гэты важны ўчастак. За кароткі час на значных плошчах была скошана трава, нарыхтавана 205 тон сена і 488 тон зялёнай масы. У час уборкі зерневых пры дрэнных умовах надвор'я саўгасу была аказана дапамога ў прасушцы зерня шляхам перапалачвання і засыпцы зерня ў свіран на захоўванне.

У цэлым усе групы шасці заездаў папрацавалі на славу, выконвалі і часта перавыконвалі нормы выпрацоўкі. У гэту вялікую работу значны ўклад унеслі і камсамольцы арганізацыі выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта.

Заробленыя ў саўгасе грошы, а таксама прэмію, устаноўленую Цэнтральным РК КПБ г. Гомеля і Веткаўскім райкомам партыі калектыву універсітэта за значную шэфскую дапамогу саўгасу «Рэчкі», па аднадушнаму жаданню універсітэцкага калектыву былі пералічаны ў Фонд міру.

Гэтым летам выезды выкладчыкаў і супрацоўнікаў ГДУ ў падшэфную гаспадарку таксама арганізоўваюцца па ранейшай сістэме. У кожным заездзе будуць прымаць удзел да 30—35 прац. камсамольцаў. У сувязі з гэтым для больш эфектыўнай работы па ўборцы і нарыхтоўцы кармоў камітэт камсамола універсітэта прапанаваў стварыць камсамольска-маладзёжны сельскагаспадарчы атрад на заезд або ўтвараць камсамольска-маладзёжныя брыгады пры кожным заездзе, узначальваць які будзе камісар брыгады. Ён абавязаны падводзіць вынікі выкананых работ на працягу ўсяго заезду, кантраляваць ход сельскагаспадарчых работ, каб вялася яна рытмічна, без зрываў.

Раней камсамольцы ў час знаходжання ў саўгасе не праводзілі пасля працоўнага дня ніякай грамадска-палітычнай работы ў вёсцы Рэчкі. Яна зводзілася толькі да арганізацыі сумесных з мясцовай моладдзю культурна-масавых мерапрыемстваў — танцаў. Таму вельмі важна, каб гэтым летам кожная камсамольска-маладзёжная брыгада праводзіла грамадска-палітычную і культурна-масавую работу ў вёсцы так, як гэта робяць байцы студэнцкіх будаўнічых атрадаў. У кожнай брыгадзе, напэўна, знойдуцца самадзейныя артысты, аматары паэзіі, музыкі. Значыць, можна падрыхтаваць канцэрт мастацкай самадзейнасці і выступіць з ім перад сельскімі жыхарамі. Ёсць, безумоўна, у гаспадарцы ветэраны і інваліды Вялікай Айчыннай вайны, людзі пажылога ўзросту, якім неабходна дапамога. Аказаць яе — ганаровы абавязак кожнага камсамольца. Пад сілу шэфам і правядзенне на месцы дыслакацыі агітацыйнай работы сярод школьнікаў для іх паступлення ў наш універсітэт (асабліва гэта неабходна рабіць тым, хто будзе працаваць у першым заездзе). Добрую памяць аб сабе можна пакінуць у вёсцы і такім падарункам як невялікая бібліятэка. Яе могуць сабраць камсамольцы універсітэта і перадаць сельскай школе.

**Аляксандр КАВАЛЬЧУК,**
**член камсамольскай арганізацыі выкладчыкаў і супрацоўнікаў ГДУ.**

## ПЕРШААДКРЫВАЛЬНІКІ

**У ГЭТЫМ ГОДЗЕ ЎПЕРШЫНЮ ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ НА МАТЭМАТЫЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ СТВОРАНЫ АТРАД ЖЫВЕЛАВОДАЎ, ЯКІ БУДЗЕ ПРАЦАВАЦЬ У ПАДШЭФНЫМ САЎГАСЕ «РЭЧКІ».**

Усё больш актыўна ўключаецца моладзь у рэалізацыю Харчовай праграмы краіны. Адметна тое, што гэта не толькі сельскія юнакі і дзяўчаты, якія непасрэдна працуюць на зямлі, але і моладзь з горада, у прыватнасці, студэнцкая. Шмат гадоў існуюць у нашым універсітэце студэнцкія атрады, якія летам працуюць у калгасах і саўгасах на праполцы гародніны, уборцы вырашчанага ўраджаю. Яны заваявалі вялікі аўтарытэт і павагу ў вяскоўцаў.

А вось сёлета вырашана правесці эксперымент—стварыць атрад жывёлаводаў для работы на малочнатаварнай ферме. Ініцыятарамі новага пачынання сталі дзяўчаты з матэматычнага факультэта. Дзесяць сапраўдных энтузіястаў вырашылі папрацаваць у час летняга семестра аператарамі машыннага даення ў падшэфным саўгасе «Рэчкі».

Усе, напэўна, могуць уявіць сабе, наколькі цяжкая праца даярак. Даводзіцца працаваць на ферме без выхадных, без водпускаў. Таму дзяўчаты пастараюцца хутчэй навучыцца ў вопытных даярак рабіць усё не горш за іх, каб потым поўнасцю замяніць жанчын, даць ім магчымасць адпачыць.

Атрад жывёлаводаў «Сож» — эксперыментальны, таму, зразумела, ёсць нямала цяжкасцей. Справа ж зусім новая, незнаёмая гарадскім дзяўчатам. Але калі ёсць моцнае жаданне справіцца з задуманым, усе цяжкасці будуць пераадолены. Галоўнае, паверыць у сябе, і тады любая незнаёмая справа павінна атрымацца!

Гаварыць цяпер аб правамернасці новага напрамку ў студэнцкім патрыятычным руху пакуль што рана. Рабіць пэўныя вывады можна будзе пасля заканчэння працоўнага семестра. Але тое, што дзяўчаты вырашылі паспрабаваць свае сілы ў такой новай, незвычайнай для іх справе, сведчыць аб многім. Палохацца цяжкасцей, адступаць перад імі — не ў характары студэнтаў, а першаадкрывальнікам новага, тым больш. Таму з цвёрдай упэўненасцю хочацца сказаць: дзяўчаты не падвядуць!

**Ірына КАЗІМІР,**
**камандзір атрада жывёлаводаў «Сож», студэнтка матэматычнага факуль-**

